*Болбас В.С.*

## СЕКУЛЯРЫЗАЦЫЯ МАРАЛЬНА-ВЫХАВАЎЧЫХ МЭТ ВА ЎСХОДНІХ СЛАВЯН СЯРЭДНЯВЕЧЧА

Пераасэнсаванне значэння маралі ў жыцці грамадства, пераарыентацыя ўсходнеславянскімі мысліцелямі XVI-XVII стст. Мэты маральнага выхавання грунтавалася на радыкальнай перамене іх поглядаў на ролю і прызначэнне чалавека ў зямным жыцці. Згодна сярэдневяковым уяўленням чалавек на зямлі павінен пастаянна памятаць аб сваёй грахоўнай прыродзе, безагаворачна адракацца ад свайго ўласнага Я, цярпеннем, пакорлівасцю і аскетызмам заслужыць сабе лепшае існаванне на тым свеце. І чым больш пакутаў выпадзе на долю індывіда, тым больш у яго шансаў карыс-





тацца райскімі дабротамі на нябёсах. Зямное жыццё разглядалася толькі як падрыхтоўка да вечнага замагільнага суіснавання. На гэтым грунтаваліся ўсе тагачасныя падыходы рэлігійна-маральнага выхавання.

Асновы крытычнага падыходу да такога разумення чалавечага быцця залажыў на землях Айчыны выдатны сын беларускага народа ўсходнеславянскі першадрукар Францыск Скарына, які нідзе і ніякім чынам не абвяргаў замагільнага свету, але арыентаваў людзей на рэальнасці „сегосветнаго жития“. На яго думку, чалавек яшчэ ў зямны перыяд мае права і заслугоўвае вартай долі. Славуты палачанін справядліва лічыцца адным з заснавальнікаў нацыянальнага гуманістычнага руху. І хаця гуманізм Ф.Скарыны больш хрысціянізаваны ў параўнанні з поглядамі заходнееўрапейскіх асноватворцаў гэтай плыні, але тым не менш ёсць усе падставы сцвярджаць, што слынны мысліцель, у імкненні давесці да людзей першапачатковы сэнс хрысціянскіх ідэй, не скажоных афіцыйнай царквой, зрабіў важкі крок у напрамку секулярызацыі маральных асноў сацыяльна-грамадскага ўладкавання.

Не згаджаліся ні з поглядамі аб прадвызначанасці чалавечага лёсу, ні з ідэямі вызначальнага ўплыву на яго звышнатуральных ці прыродных сіл вядомыя славянскія асветнікі – браты Лаўрэнцій і Стэфан Зізаніі. Калі ў Маскве была зроблена спроба абвінаваціць Лаўрэнція ў распаўсюджванні поглядаў аб падпарадкаванні чалавечага лёсу нябесным зоркам, асветнік катэгарычна заявіў, што ён праціўнік меркаванняў „чтобы звездами правитися житию нашему“ [1, 143]. „О крузех небесных и о планитах, и о зодиях, и о затмении солнца, о громе, и о молнии, и о тресновении, и о шибении, и о перуне, о комитах, и о прочих звездах ... толко аз написал ведомости ради, чтобы человек ведал, яко то есть тварь божия“ [1, 142-143], – сцвярджаў Л.Зізаній.

Яшчэ больш радыкальныя ідэі абвяшчаў вядомы айчынны педагог-атэіст XVIIст., ураджэнец Брэсцкага павету, Казімір Лышчынскі. Будучы перакананым носьбітам погля-

даў стыхійнага матэрыялізму, ён у рашучай форме абвяргаў не толькі дактрыны тагачаснай афіцыйнай царквы, але і ўсе рэлігійныя вучэнні наогул.

К.Лышчынскі не прызнаваў існавання ў прыродзе любых звышнатуральных сіл. Адмаўляючы наяўнасць таго свету, мысліцель зрабіў замах на адзін з галоўных пастулатаў тэолагаў – бессмяротнасць душы. Паводле судовых абвінавачванняў ён не верыў ні ў рай, ні ў пекла, параўноўваў душы людзей з душамі жывёл.

Не пагаджаўся з поглядамі сярэднявечча на зямны перыяд жыцця чалавека, як нешта другараднае, амаль не ўяўляючае ніякай каштоўнасці беларуска-рускі мысліцель Сімяон Полацкі. Ён, наадварот, лічыў час зямнога існавання як найвялікшую каштоўнасць, якой кожны павінен беражліва распарадзіцца. „Злато погубленное может ся нажити, время же протекша несть лет возвратити" [1, 262], – слушна заўважаў педагог.

Як сведчаць факты адной з характэрных асаблівасцей этыка-філасофскіх ідэй слынных усходнеславянскіх мысліцеляў разглядаемага перыяду была схільнасць да антрапацэнтрызму, уяўленні аб чалавеку як самай галоўнай каштоўнасці ў свеце, якому павінна падпарадкоўвацца ўся жывая і нежывая прырода. А гэта ў сваю чаргу істотным чынам уплывала на фарміраванне маральна-выхаваўчых падыходаў айчыннай педагагічнай думкі.

Прадстаўнікі шматлікіх напрамкаў педагагічнай думкі славян былі ўпэўнены, што ў станаўленні чалавечай асобы галоўным з'яўляецца фарміраванне яе духоўнага свету. Украпваючы ж мараль ва ўсе віды чалавечай дзейнасці, яны тым самым узнімалі яе да ўзроўню вызначальнага фактару ў развіцці кожнага індывіда.

Дапамагаючы людзям уразумець сэнс іх жыццёвага шляху на зямлі, Сімяон Полацкі ўказваў, што чалавечае шчасце схавана ў яго ўласных дабрачыннасцях, якімі кожны павінен пастаянна ўзбагачацца. "Добродетелми богат быти тщися, паче сокровищ теми прославися" [1, 62], – заключаў асветнік. Ён катэгарычна папярэджваў, што набыццё маральных якасцей значна каштоўней любых матэрыяльных скарбаў, нават царскіх.

Педагог-філосаф неаднаразова падкрэсліваў, што галоўнай выхаваўчай задачай павінна быць развіццё дабрадзейнасці, якая цалкам вызначае духоўны свет індывіда. Уся маральна-выхаваўчая спадчына асветніка – гэта сапраўдны апофеоз "добронравию, яко без оного аки тело без души есть". Такое разуменне сэнсу жыцця, зместу шчасця, значэння духоўнасці яшчэ больш абумоўлівала прыярытэтнасць увагі маральна-выхаваўчым пытанням у грамадскай і педагагічнай думцы усходніх славян разглядаемага перыяду.

Літаратура

1. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии / Избранные произведения XVI-начала XIX в./. - Мн.: Изд-во АН БССР, 1962. - 524 с.

*Лутович Т.Ф., Кочубей Е.М.*